Малая радзіма Дзяржынскі раён

Алена Стэльмах

НАВАСАДЫ

МІНСК
ВЫДАВЕЦТВА «ЧАТЫРЫ ЧВЭРЦІ»
2021

УДК 821.161.3.09+929
ББК 83.3(4Беи)
С79

Кніга «Навасады» — чацвёртая ў творчым праекце Алены Стэльмах і Уладзіслава Цыдзіка. Першымі былі фотакнігі «Зачараваны Беларуссю», «Бачу Беларусь такой», «Мая Радзіма». Працягваючы ўжо вядомы беларусам праект, Алена Стэльмах цяпер распавядае пра дарагі для яе куточак на карце Радзімы — вёску Навасады.

Серыя заснавана ў 2015 годзе

Рэдакцыйны савет:
Зіновій Прыгодзіч, Алесь Карлюкевіч, Ліліяна Анцух,
Навум Гальпяровіч, Аляксандр Саракач, Віктар Праўдзін, Валянціна Клімовіч, Вольга Ігнатава

Прадмова
Уладзімір Саламаха

Стэльмах, А. А.

С79 **Навасады** / Алена Стэльмах ; прадмова Уладзімір Саламаха. — Мінск : Чатыры чвэрці, 2021. — 156 с. : іл. — (Серыя «Малая радзіма. Дзяржынскі раён»).

ISBN 978-985-581-502-1.

Навасады — малая радзіма Алены Стэльмах, якая стала вялікім сусветам для пісьменніцы. Гэта кніга распавядае пра яе асабісты лёс і лёс некалькіх пакаленняў жыхароў у кантэксце гісторыі старажытнай вёскі.

Вёска Навасады адметная ў Дзяржынскім раёне: з незвычайным гарыстым рэльефам — спадчынай колішняга ледавіка, курганнымі могільнікамі, а таксама ўнікальнай крынічкай — гідралагічным помнікам прыроды.

Аздабляюць аповед архіўныя матэрыялы, гістарычныя фотаздымкі і аўтарскія творы, што нарадзіліся на роднай зямлі.

Адрасуецца шырокаму колу чытачоў.

УДК 821.161.3.09+929
ББК 83.3(4Беи)

ISBN 978-985-581-502-1

© Стэльмах А. А., 2021
© Афармленне. ТДА «Выдавецтва “Чатыры чвэрці”», 2021

Берагі маёй душы

Як сонечныя праменьчыкі з высокага неба імкнуцца прабіцца ў глыбінныя куточкі зямлі, так і нам хочацца іншым разам звярнуцца да самых патаемных вузельчыкаў сваёй памяці. Гэта цяпер ты — асоба, што ўсведамляе, з якіх крупінак-крышаноў змяшаны, з якога цеста злеплены яе лёс. Караскаўся, тужыўся, каб узабрацца на вяршыню высокай гары, праўда, нікім не пазначанай на геаграфічнай карце. І тым не менш разумеў: ёсць яна, твая вышыня, і назва яе такая інтрыгуючая і ўсёабдымная — «жыццё». Кажуць, «жыццё» — гэта «выпрабаванне чалавека на чалавечнасць».

Цяпер пазіраеш з той, сваёй гары ўніз, гартаеш старонкі прабеглых дзён — і дух пераймае: колькі ж там усяго прыкіпелага, трапятлівага і блізкага! Праз павелічальнае шкло часу многае можна разгледзець нават да драбнічак. Мацней за ўсё вабіць далёкае, але чым далей, тым больш прыцягальнае дзяцінства. Яно як аблашчаны вачыма ярка-чырвоны яблык у верхавіне разгатага дрэва. Бачыш яго, а паспрабуй сарві. Ніякая лесвіца не здольная дацягнуцца…

Дзяцінства. Для многіх пакаленняў творцаў, ды і не толькі для іх, яно атаясамліваецца з вёскай. Яшчэ ў не такім далёкім мінулым пераважная большасць беларусаў жыла ў сельскай мясцовасці, а таму і звычкі, і традыцыі, і лад жыцця, і светапогляд — з існых канонаў калыскі, вуліцы, зямлі… «Усе мы з хат», — як не пагадзіцца са слынным пісьменнікам Янкам Сіпаковым. І яшчэ хочацца дадаць: з празрыстых росаў, з водару траў, са смаку сырадою, з пошуму лясоў…

Адсюль і складзены на працягу стагоддзяў менталітэт беларускай нацыі. Досвед маем такі, якім у многім надзяліла нас вёска, што і адрознівае беларусаў ад іншых народаў у шмат'яўным свеце.

Але жыццё — гэта жвавы жарэбчык нястрымны, незацугляны. Рухавік жыццёвага запалу даўно перастаўлены з колаў на тэхналогіі амаль касмічных хуткасцей. І ў той жа час многія паселішчы засталіся пакінутымі каласкамі, счарнелымі ад восеньскіх дажджоў на

старым іржышчы. Вёска мяльчэе ўслед за ўсохлымі пасля меліярацыі рэкамі. Так званыя аграгарадкі — гэта ўжо іншыя цэнтры вытокаў беларускай духоўнасці, як бы пра іх дабрабыт ні рупіліся.

Блішчаць агнямі гарады, уражваюць гмахамі адмысловых новазбудаванняў, вабяць шматлікімі вытанчанымі спакусамі. Ад далікатэсаў, раней смакаваных на вяскоўі хіба што на вялікіх святах, ломяцца сталічныя прылаўкі.

Вось такія яны рэаліі сучасных перамен, не лічыцца з якімі ўжо немагчыма. Кажуць, што ў працэсе развіцця чалавечага грамадства настае эра так званай лічбавай цывілізацыі. Робаты, штучны інтэлект, разумныя рэчы, глабалізацыя…

Жыццё віруе, ліхаманкава перайначвае сваё рэчышча, а супольна з ім мяняюцца і ўстойлівыя, здавалася б, чалавечыя стасункі.

Як вядома, айчынная літаратура створана на падмурку нацыянальных вытокаў. Яна ідзе з глыбіні душы тутэйшых яе носьбітаў і ўспрымаецца грамадствам як належнае, свойскае, радзіннае. У шматколер'і фарбаў часу і прасторы квітнее спадчына блакітнай валошкаю — сімвалам адвечнай Радзімы.

Якія абрысы новай явы ўзрушаць творцу? Чые вобразы ўпадабаюць паэты? Пра што напішуцца новыя раманы і аповесці? Што будзе цешыць і наталяць душу чалавека надалей? Час-вядун пакуль толькі ставіць пытанні…

А вёска, такая шчымліва-блізкая, разам з тым ужо такая далёкая, нібы сплываючы назаўсёдна карабель, нетаропка развітваецца, падхопленая ціхаплыннымі хвалямі часу. Яны свавольна набягаюць на берагі маёй душы і трывожаць яе мімалётнымі ўспамінамі…

Гэтая кніга — споведзь перад вамі, мае дарагія Навасады, мае шаноўныя землякі. Тут пра ўсё тое, што без цябе б, мая малая радзіма, не адбылося ні ў мяне, як і ў нікога іншага. Пішу. Бо, як вядома, напісанае застаецца…

З павагай,
Алена Стэльмах

Адкуль ідуць карані...

У матэрыялах даследаванняў, праведзеных непадалёку ад вёскі Навасады ў 1928 годзе археолагамі А. М. Ляўданскім і М. Н. Канвісаравым, адзначана: «Гарадзішча “Замак” знаходзіцца за 400 м на поўдзень ад вёскі, на беразе рэчкі Слаўка, займае мыс, утвораны берагам ракі і глыбокім ярам, у траншэях і шурфах знойдзена ляпная штрыхаваная і ганчарная кераміка, якая адносіцца да ранняга жалезнага веку і эпохі Кіеўскай Русі. Гэты перыяд на тэрыторыі Беларусі пачаўся ў VIII–VII стагоддзі да н.э. і працягваўся да V стагоддзя н.э. Гэта азначае, што замчышчу больш чым 2 000–2 400 гадоў.

Селішча 1. Яно прымыкае да гарадзішча “Замак” з усходняга боку, на левым беразе ракі Слаўка, плошча — 1,5 га, абследавана ў 1928 годзе, даследавана ў 1960 годзе Э. М. Загарульскім. Тут былі знойдзены часткі ганчарных вырабаў, якія адносяцца да эпохі Кіеўскай Русі.

Селішча 2. Насупраць гарадзішча “Замак”, на правым беразе ракі Слаўка.

Курганны могільнік за 0,3–0,4 км на ўсход ад гарадзішча, справа ад дарогі Юцкі–Крыштафова — 95 насыпаў, размешчаных 2 групамі, вышыня — 1,5–2 м, дыяметр — 8–10 м. У 5 насыпах прасочваецца пахавальны абрад трупаспальвання. У адным з курганоў было выяўлена пахаванне па абрадзе трупапалажэння, знойдзена ганчарная кераміка. Знаходкі датуюцца 2-й паловай — канцом X стагоддзя н.э.». *(Збор помнікаў гісторыі і культуры)*

НАВАСАДЫ

Камяні на старых могілках — сведкі мінулага жыцця

Гістарычны экскурс

Адпаведна дакументам, якія захоўваюцца ў Дзяржаўным гістарычным архіве Беларусі, вёска Навасады згадваецца з канца XVIII стагоддзя.

Як вядома, у студзені 1793 года адбыўся другі падзел Рэчы Паспалітай, і Навасады, як і іншыя беларускія землі, далучылі да Расійскай імперыі. Мінскі павет, які падзяляўся на 17 валасцей, праіснаваў да 1924 года. Навасады ўваходзілі ў склад Койданаўскай воласці.

У 1800 годзе Навасады, дзе было 20 двароў і 138 жыхароў, а таксама Малыя Навасады з 7 дварамі і 48 жыхарамі належалі да ўладанняў Радзівілаў, якія перадалі гэтую мясцовасць у карыстанне мінскаму стольніку Ліхадзіеўскаму. Між іншым, Радзівілы валодалі Койданаўскай воласцю з 1551-га па 1831 год. За ўдзел у паўстанні 1830–1831 гадоў воласць канфіскавалі на карысць дзяржавы. З 1878-га па 1917 год гаспадарылі ў Койданаўскай воласці расійскія чыноўнікі Сакалоў і Касакоўскі.

У сярэдзіне XIX стагоддзя Навасадамі валодаў памешчык І. Бярновіч. На карце, датаванай 1865 годам, у вёсцы пазначана 30 двароў, а каля рэчкі Слаўка відаць маёнтак і палеткі. У адной хаце на той час жыло не менш за восем чалавек.

У 1870 годзе Навасады налічвалі 113 асоб мужчынскага полу. Вёска ўваходзіла ў склад Навасадскай сельскай грамады і маёнтка Копцеўшчына памешчыкаў Вайцяхоўскіх.

Напрыканцы XIX стагоддзя ў сяле Навасады налічвалася 307 жыхароў. Дзейнічала царква, працавалі хлебазапасны магазін, карчма, вадзяны млын.

У 1917 годзе ў вёсцы было 70 двароў, 451 жыхар, у маёнтку — 150 чалавек.

Карта мясцовасці ў другой палове XIX ст.

Як вядома, 9 сакавіка 1918 года была абвешчана Беларуская Народная Рэспубліка. Навасады на той час знаходзіліся пад нямецкай акупацыяй. У лютым 1919 года гэта тэрыторыя перайшла пад падпарадкаванне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, а пазней увайшла ў склад Беларуска-Літоўскай ССР.

Летам 1919 года вёску занялі польскія войскі. Асноўнай іх мэтай было аднаўленне Польшчы ў гістарычных межах Рэчы Паспалітай 1772 года з устанаўленнем кантролю над Беларуссю, Украінай, Літвой і геапалітычным дамініраваннем ва Усходняй Еўропе. Пасля падпісання 30 красавіка 1921 года Рыжскай мірнай дамовы тэрыторыя Койданаўскай воласці вярнулася ў падпарадкаванне Беларускай ССР.

З 20 жніўня 1924 года Навасады з'яўляліся цэнтрам сельскага савета Койданаўскага раёна Мінскай акругі. У 1932 годзе Койданава перайменавалі ў Дзяржынск. Да 1937 года Навасады ўваходзілі ў склад Дзяржынскага польскага нацыянальнага раёна.

З 23 сакавіка 1932 года па 14 мая 1936 года Навасадскі сельсавет з'яўляўся польскім нацыянальным сельсаветам. Нягледзячы на тое, што ў раёне дзейнічалі польскія школы, выдаваліся польскія газеты і часопісы, а польская мова была адной з афіцыйных, Навасадскі польскі сельсавет палітыка саветызацыі польскага насельніцтва датычыла ў меншай ступені. Тут жылі пераважна беларусы.

31 ліпеня 1937 года Дзяржынскі нацыянальны раён быў скасаваны, а тэрыторыя Навасадскага сельскага савета ўвайшла ў Заслаўскі раён. 4 лютага 1939 года Дзяржынскі раён быў адноўлены, з таго часу Навасады знаходзяцца ў яго складзе.

Мы — неаддзельныя ад нашчадкаў

Імклівы час многае сцірае з памяці. Людзям уласціва забывацца нават пра грандыёзныя падзеі, адыходзяць у нябыт і неардынарныя асобы… Але калі ў пэўны момант, няхай сабе і не такі знакавы, у патрэбным месцы апынецца чалавек з фотаапаратам — значыць, нашчадкі атрымаюць магчымасць адчуць подых даўніх часоў, стаць сведкамі мінулага, пераканацца ў повязі пакаленняў.

У фотаздымка ёсць дзіўная ўласцівасць: варта зрабіць націск на кнопку фотаапарата — і ў адлюстравання пачынаецца новае жыццё, пераважна невядомае героям здымкаў. Захаванню гістарычнай памяці служаць як маштабнага ўзроўню (дзяржаўныя) архівы, так і тыя, што зберагаюцца ў кожным доме. На звычайных, на першы погляд, здымках стаяць знакавыя пячаткі часу. Тут важная кожная дэталь, кожная, здавалася б, дробязная абставіна. Яны яскрава падкрэсліваюць каларыт эпохі, становяцца часткай яе жыццяпісу.

Надзея Санцэвіч, яе сястра Стэфаніда з мужам Канстанцінам Веркавічам. Пачатак XX ст.

Вясковае дзяцінства. 20-я гг. XX ст.

Васіль Сантаровіч.
20-я гг. XX ст.

Мікалай Грыб.
30-я гг. XX ст.

Міхаіл Сантаровіч.
30-я гг. XX ст.

Яўгенія Грыб.
30-я гг. XX ст.

Марыя і Міша Сантаровічы.
50-я гг. XX ст.

Шлюбнае фота
Марыі і Івана
Сантаровічаў.
1950 г.

Нас яднае Радзіма

Пра аўтара

Алена Анатольеўна Стэльмах

Нарадзілася 20 ліпеня 1965 года ў в. Навасады Дзяржынскага раёна. Скончыла факультэт журналістыкі Белдзяржуніверсітэта, Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Працавала галоўным рэдактарам раённай газеты «Узвышша» (г. Дзяржынск), галоўным рэдактарам «Белорусской лесной газеты», намеснікам дырэктара Выдавецкага дома «Звязда».

Суаўтар і ўкладальнік кніг «Зачараваны Беларуссю», «Бачу Беларусь такой», «Мая Радзіма», а таксама серыі кніг, прысвечаных беларускаму лесу.

Аўтар шэрага публіцыстычных твораў і кніг для дзяцей «Дуб і крумкач» (у двух рэдакцыях), «У гасцях у Францыска Скарыны», «Вялікае прадстаўленне для Сонечкі», «Павучок Славік», «Супоўніца Міла», «Папяровы самалёцік».

Творы Алены Анатольеўны перакладзены на мовы народаў СНД, а таксама польскую, сербскую. Удзельнік міжнародных форумаў па пытаннях літаратуры і дзіцячага чытання. Член журы Нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі», «Нацыянальная літаратурная прэмія».

Уладальнік медаля Францыска Скарыны. Узнагароджана нагрудным знакам «Выдатнік друку» (Беларусь), медалём Еўразійскай міжнароднай прэміі (За асаблівыя дасягненні, «Публіцыстыка»), залатым медалём Васілія Шукшына (Расія), медалямі «За ўклад у літаратуру» (Беларусь), «За ўмацаванне міжнацыянальнага міру і згоды» (Расія).

Першы намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі. Заслужаны журналіст Беларускага саюза журналістаў. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі і Саюза пісьменнікаў Расіі.

Змест

Нязгаснае святло Радзімы. *У. Саламаха* 5

Берагі маёй душы. *А. Стэльмах* 8

АДКУЛЬ ІДУЦЬ КАРАНІ... 10

Гістарычны экскурс 12

Метрычныя кнігі 14

Навасадская Свята-Успенская царква 16

Як выглядала хата ў Навасадах 19

Такім быў сялянскі двор 20

Маўклівыя сведкі — старыя здымкі 23

Мы — неаддзельныя ад нашчадкаў 24

Тапаніміка 28

Імёны нашых продкаў 28

Асаблівасці навасадскага жыцця 28

Таньчына хата 30

Навасадская гарыстасць 30

Навасадская крынічка 31

Сцюдзянец 32

Дуб-абаронца 33
Дуб і крумкач (казка-прытча) 34

ГАДЫ ЦЯЖКІХ ВЫПРАБАВАННЯЎ 41
Ахвяры рэпрэсій 1930–1950 *гг.* 42
З успамінаў старажылаў 43
З біяграфіі падпольшчыка 46
Ахвяры Вялікай Айчыннай вайны 47
З баявой характарыстыкі Віталя Сантаровіча, майго дзеда 50
Яны вярнуліся пераможцамі 53

ВЯРНУЦЦА Ў ДЗЯЦІНСТВА 54
Незабыўнае маленства 54
Вечаровае 55
На пачатку дарог 57

ЗНАКАМІТЫЯ ЗЕМЛЯКІ 84
Людзі адной эпохі 84
Карусь Каганец 85
Максім Багдановіч пра Каруся Каганца 87
Ліст Каруся Каганца з турмы да жонкі 88
Навасадскае замчышча 88
Навасадскія ваколіцы 91
З даследаванняў Вікторыі Навумавай, маёй дачкі 92

РОДНЫЯ І БЛІЗКІЯ РАСПАВЯЛІ МНЕ... 94
З успамінаў Валянціны Вітольдаўны Матусевіч (Сантаровіч), маёй матулі 94
Выжывалі наймацнейшыя 94
Радасць вызвалення 95
За парты селі і пераросткі 96
І мы пайшлі ў гару... 98
Дзень добры, юнацтва! 98
Незабыўнае для Зоі Вітольдаўны Крывіцкай (Сантаровіч), маёй цётачкі 99
Дзе пачаўся род Марыі Іосіфаўны Веркавіч (Бандарык), паважанай суседкі 102
Заўсёды радуецца жыццю Анатоль Іванавіч Гармаза,
сусед па вёсцы і даўні сябар 106
Пра новае жыццё ў Навасадах распавядае
Валянціна Уладзіміраўна Веркавіч 108
«У Навасадах — як у Карпатах», — лічыў Іосіф Іосіфавіч Грыб,
дваюрадны дзядзька па мацярынскай лініі 113
Пра трох анёлаў расказвае Эла Іосіфаўна Чарнова, мая стрыечная сястра 114
Слёзы Багародзіцы 117
Гусіная гісторыя 118
Павадыр (казка-прытча) 120
Пра свае залатыя вёсны ўзгадвае Леаніда Сцяпанаўна Шышкавец 124
Страта (апавяданне) 125

ДАРОГА ДАДОМУ 137
Вяртанне 138
Родная старонка 139
Пра вераб'я 139
Каліны куст 141
Грыбазбір 142

З ХРОНІКІ НАВАСАДСКАГА ЖЫЦЦЯ 145
Помнім пра свае карані 149

Пра аўтара 151